Цана асобнага нумару 20 гр. Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ГОЛАС ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрасу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвесткі: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 3 Вільня, Субота 21-га красавіка 1928 г. Год 1

Вясьняныя думкі.

Вясна што-раз болей забірае свае правы. Сьнег ужо ўсюды пасходзіў з палёў і на яго месца поруч з зялёнаю руньню пачынае дзе-ня-дзе зелянець трава.

Вясна—гэта сьветлая, радасная пара году. Цепладайнае сонца, ажыўляючы ўсю прыроду, улівае сьвежасьць і весялейшыя настроі і ў людзей. Вясну прыраўноўваюць з моладасьцю і называюць ранкам году. Радасна спатыкаюць вясну ўсе. Не абмінае яна таксама і сялян ды работнікаў. Работнік у месьце радуецца, што трэба будзе меней паліць у печы і рабіць іншыя выдаткі, зьвязаныя з холадам. Селянін у весцы нецярпліва чакае царства вясны, каб пакінуць нарэшце цяжкія думкі аб корме скаціны і г. д. Ня трэба ўжо казаць аб агульнай радасьці — адчуваньні яснага і цёплага сонца. То-ж гэта — запраўды сьвята для ўсіх. Не дарма-ж вясною так шмат сьвятаў і ўсё такія вясёлыя: Вербніца, Вялікдзень, Радаўніца, Юр'я, Сёмуха, Мікола і ўрэшце—Купала.

Гэта ня толькі хрысьцянскія сьвяты, гэта рэшткі тых паганскіх, дахрысьціянскіх часоў, калі чалавек жыў разам з прыродай і гучна адклікаўся на ўсе яскравейшыя праявы яе, пяючы ей гімны, якія яшчэ і дасюль у форме розных песень і звычаяў ня страцілі сваей вагі і прыемнасьці. Ня кажам ужо аб заможных клясах, якія, не адчуваючы дрэнных бакоў, якія прыносіць вясна, у сваей літэратуры не знаходзіць проста слоў, каб славіць гэтую найпрыгажэйшую пару году.

Але мы, сяляне і работнікі, з прыходам вясны адчуваем ня толькі радасьць. Часам вельмі сумныя настроі тут спараджае вясна, ня гледзячы на яе прыгожасьць.

У селяніна выходзіць хлеб і ўва многіх яго ўжо няма. Бульба таксама зьедзена за доўгую зіму. Заработкаў няма. А тут, як на злосьць, расьце дарагоўля і то якраз на гэты сам хлеб ды іншыя спажывецкія прадукты, наганяючы і на селяніна і асабліва, скажам, на мястовага работніка, поруч з радаснымі настроямі, таксама і цяжкі сум. Недарма нашыя поэты горка жалуюцца.

Прастор, прастор і воля там —
Але ці нам яны, ці нам?

Так, бязумоўна, вясна селяніну і работніку прыносіць ня толькі радасныя настроі, а таксама і беспасярэднія чорныя думкі аб заўтрашнім дні. Калі да гэтага дадаць узрост безработцьця — то прыгожы малюнак вясны ў шмат каго зацямняецца, яго ня відно амаль.

Голад — вось другі бок вясьнянага малюнку, якога ня бачаць заможныя клясы, але які сваім абліччам зьвернены якраз у бок працоўных, змушаючы шмат аб чым падумаць. Голад—ня цётка. Ен змушае людзей пільней сачыць за сваім і за людзкім жыцьцём і ўрэшце—вучыць. Так, голад таксама вучыць, вучыць і жыць і думаць. Ня зусім няправільная думка, што цар—голад творыць і новыя формы жыцьця, адказваючыя больш шырокім народным гушчам. Ен вучыць арганізоўвацца.

Можна прасачыць гэтыя вымаганьні голаду ў адносінах да арганізацыі ад пачатку людзкога жыцьця, але на гэта тут не хапіла-б месца і ёсьць спэцыяльныя на гэта кніжкі. Тут трэба зьвярнуць увагу, якія думкі выклікаюцца цяпер у зьвязку з гэтым другім бокам вясьнянага малюнку.

Чаму вясною настае голад?

Скажам проста, што галоўнаю прычынаю зьяўляецца няправільны распадзел спажыўцоў. Увосень, калі ёсьць хлеб, багацейшыя стараюцца прадаць яго, каб запоўніць недахопы ў гаспадарцы. А багатыя абшарнікі стараюцца сплавіць яго за граніцу, дзе тады хлеб даражэй. І вось вясна прыходзіць з недахопамі хлеба ў-ва ўсім краі, а ў зьвязку з гэтым расьце і дарагоўля.

Ня менш прычыняюцца да гэтага і прыватныя гандляры, якія скупіўшы прадукты ў восень па танмай цане, цяпер выкарыстоўваюць недахоп іх, каб прадаць даражэй і набіць свае кішэні.

Дзе-ж выхад?

Сталасьць гэтага зьявішча скіравала думкі працоўных у двох кірунках: да стварэньня сацыялістычнага ладу, які дбае перадусім аб правільным распадзеле прадуктаў і, поруч з гэтым, да *стварэньня каапэратываў*.

Каапэратары ўважаюць каапэрацыю за адзін з спосабаў заваяваньня працоўнымі сваіх правоў. Гэта спосаб мірнага заваяваньня. Калі ўвесь край пакрыецца густою сеткаю каапэратываў, адпадуць перакупшчыкі і прыватныя гандляры. Каапэратывы будуць дбаць і аб прыходзе вясны. Каапэрацыя налічвае ўжо шмат гадоў істнаваньня, у-ва многіх краёх яна дасягла ўжо вялікіх вынікаў. У нас, дзякуючы вайне, спаду валюты і зьвязаным з гэтым перабоям у гандлі—каапэрацыя згубіла сваю папулярнасьць. Але ці траціць вагу ад гэтага самая думка?

Не, ніколі! Думка гэтая — здаровая і яна не загіне. І цяпер, у дні прыгожай вясны, у аблічча дарагоўлі і голаду — працоўныя гушчы мусяць зноў падумаць аб каапэрацыі.

Так! Гэта адзіны з магутных засобаў узмацаваньня сябе, як пэўных клясаў грамадзянства. Каапэрацыя павінна стацца жывою думкай працоўных.

Дык да працы па закладаньню каапэратываў! *)

*) Як залажыць каапэратыў, лёгка даведацца на першы раз з кніжкі Манцэвіча: „Як залажыць каапэратыў". Ц. 10 гр.

Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

20 дзень працэсу 28. III. 28 г.

Сьв. Барушка Сьцяпан чуў ад нейкага Макарэвіча, што ў прыпадку ліквідацыі Грамады наступіць праца нелегальная. Быў сябром КПЗБ і ніякай розьніцы паміж Грамадой а КПЗБ ня бачыць: абедзьве імкнуліся да рэвалюцыі. Грошы для Грамады атрымоўваліся з Расеі. Па пытаньнях абароны высьвятляецца, што Грамада не прыняла яго ў лік сваіх сяброў дзеля таго, што ён належаў да камуністычнай партыі.

Далей ідзе адчытаньне паказаньняў **сьв. Чарноцкага**, які цьвердзіць, што погляды Астроўскага вельмі збліжаюцца да камуністычных. Засобы да жыцьця атрымліваў з нейкіх цёмных крыніц. У сувязі з гэтым паказаньнем адв. праф. Пятрусэвіч складае Суду цэлы рад довадаў, датычучых асобы абв. Астроўскага і адымаючых усякую вагу паказаньня сьв. Чарноцкага.

Грабоўскі Язэп, пал., кажа, што абв. Гмыр Уладзімер хадзіў па вёсках і намаўляў людзей, каб запісваліся ў Грамаду, якая вяла працу амаль-што камуністычную. На нейкім сабраньні старшыня Гуртка пхнуў прысутнага паліцыянта і сказаў яму „зьнімі шапку". Зьбіраліся складкі на М.А.П.В.П., як напр. у вёсцы Сачыпах. Абарона высьвятляе, задаючы рад пытаньняў сьведцы, што грошы зьбіраліся не на М.А.П.В.П. (гэтае арганізацыі сьведка навет і не разумее), а на арыштаваных сяброў гуртка — Скрабута і Хвядчэню—якія былі ў дадатку краўнымі абв. Гмыра, і якім гэтыя грошы беспасярэдна былі пасланы.

Сьв. Ярош рабіў рэвізію ў абв. Ката Янкі і знайшоў чатыры адозвы камун., якія абв. Кот падняў на дарозе.

Эмігрант Картуша кажа, што грамадаўцы ня пушчалі яго на драм. рэпэтыцыі і сабраньні гуртоў, бо ня меў запросін.

Сьв. Невэнглоўскі кажа аб сабраньні ў вёсцы Аранчыцах, на якім прамаўляў абв. Патапчук. У гэтай прамове Патапчук казаў аб тым, што ў Польшчы замнога войска і паліцыі, няма бел. школаў, падпальваў слухачоў, каб ня слухалі валасных уладаў і часта зьвяртаўся да паліцыі з запытаньнямі, чаму яна перасьледуе Грамаду, легальную партыю. Некаторыя сябры Грамады прызнаваліся, што Цэнтр. Сэкр. Грамады быццам атрымліваў грошы на арганізацыю з Расеі. Абв. Бурсэвіч прыслаў Патапчуку пісьмо, у якім казалася аб помачы з боку бальшавіцкага ГПУ.

Абв. Патапчук асьвядчае, што ніякага пісьма ад Бурсэвіча ён не атрымаў і што паказаньне сьведкі ёсьць ня праўдай.

Сьв. Житкевіч і Скурковіч кам. пал. у Валажынах нічога новага да справы ня ўносяць.

Сьв. Замковіч М. быў на сабраньні ў Аранжыцах, на якім прамаўляў абв. Патапчук. Аб тым, што ня трэба слухаць валасных уладаў і аб паўстаньні Патапчук нічога не казаў.

21 дзень працэсу. 29. III. 28 г.

Сьв. Дзялак Т. у траўні 1926 г. даведаўся аб нейкай тайнай арганізацыі на абшары Ваўкавыскага пав. Абв. Шкодзіч быццам меў упаважненьне закладаць гурткі. У сваіх прамовах Шкодзіч казаў аб стварэньні незалежнай Беларусі, аб патрэбе для белар. народу школ у роднай мове. З 12 гуртоў на абшары Падароскае вол., Ваўкав. пав. найнебясьпечнейшым быў гурток у в. Галышках, які дамагаўся адарваньня ад Польшчы.

Адв. Дурач: скуль пан мае гэтыя ведамасьці? Сьв.—ад мяйсцовае люднасьці, прозьвішч ня памятаю.

Падчас рэвізіяў аружжа нідзе ня знойдзена. З бел. газэтаў, апрача грамадаўскіх, атрымоўваліся таксама „Бел. Крыніца" і „Сялянская Ніва".

Сьв. Мікуловіч знае Патоцкага ад малых гадоў, калі ён вучыўся ў Расеі і па сканчэньню школы застаўся вучыцелем. Ад мясцовай людности чуў, што Патоцкі на сабраньнях гуртка казаў аб незалежнай Беларусі, аб сялянска-работн. урадзе, які ўтворыць большасьць народу, аб белар. школах. Другі ж абв. Шкодзіч—імкнуўся да зьдзейсьненьня гэтых мэтаў шляхам паўстаньня. Дзеля арганізацыі паўстаньня часта езьдзіў у Вільню, у Цэнтр. Сэкр.

Абв. Шкодзіч свае наездкі ў Вільню тлумачыць тым, што ён адвозіў брата ў гімназію і ня раз падвозіў яму харчоў.

Сьв. Дробнік Антоні—кажа аб Шчыгліньскім, як аб дужа актыўным дзеячу Грамады, які закладаў гурткі і ўтрымоўліваў нелегальна ў сваей вёсцы бел. школу, за што быў накараны 7 днямі арышту.

Абв. Шчыгліньскі высьвятляе справу са школай гэтак: 60 сялян іх вёскі напісалі просьбу да школьнага інспэктара аб адчыненьні бел. школы і выпаўнілі ўсе фармальнасьці. Інспэктар сказаў, што, пакуль адчыніцца ўрадавая бел. школа, можна вучыць прыватна і забраў з вёскі польскую вучыцельку. Шчыгліньскі вучыў якраз адзін тыдзень і быў накараны за нелегальнае арганізаваньне школы.

Сьв. Валынчык ня чуў, каб Патоцкі калі небудзь казаў аб адарваньні ад Польшчы.

Сьв. Рачка сол. в. Крачкі кажа, што ў іх вёсцы яшчэ перад паўстаньнем гуртка сяляне выпісвалі белар. газэты. З газэт даведаліся, што можна легальна арганізавацца і залажыць гурток. Калі набралася 8 чалавек, зрабілі арганізацыйную сходку і выбралі камітэт. Праца была слабая, бо староста не дазваляў на сабраньні. Сяляне іх вёскі добра ведаюць абв. Бурсэвіча, як добрага арганізатара. Грамада ня спрыяла камуністам, бо ў склад яе ўваходзілі ўласьнікі зямлі дробныя і сярэднія, якія імкнуліся да зьдзейсьненьня сваіх мэтаў шляхам легальнай працы.

Сьв. Карчмарак, пал., кажа, што абв. Патоцкі быццам прызнаўся яму ў-ва ўсіх сваіх плянах, ня будучы навет з ім добра знаёмым. Патоцкі хваліў савецкія ўлады, ганіў Польшчу і казаў аб незалежнай Беларусі. Абв. Патоцкі асьвядчае, што ён нічога паліцыянту не казаў, а толькі на яго запытаньне, як ён разумее арт. 2 праграмы Грамады, дзе ёсьць мова аб сялянска-раб. урадзе, адказаў, што гэты ўрад выбярэцца большасьцю народу і што ён ня будзе такім, як ў Савецкай Беларусі.

Сь. Лях, грамадзіст, кажа, што 50 проц. іх сяброўскіх складак заўсёды насылаліся ў Цэнт. Сэкр. Грамады. Аб ніякай лучнасьці Грамады з камуністамі ніколі ня чуў. Ідэалам Грамады была незалежная Беларусь.

Сьв. паліцыянты Марко, Макараў, Ваўкоўскі—нічога новага ня ўносяць і паўтараюць тое самае аб абв. Патоцкім, Якоўскім і Шкодзічу, што ўжо казалі папярэднія сьведкі.

Сьв. Пабудзень і Мірко знаюць добра абв. Шкодзіча, які заўсёды падкрэсьліваў, што Грамада ёсьць арганізацыяй легальнай і легальным шляхам ідзе да зьдзейсьненьня сваіх мэтаў. Ад колькасьці сяброў Грамады будзе залежаць колькасьць паслоў белар. у Сойме.

Сьв. Мінкоўскі, канфідэнт, даведаўся ў траўні 1926 г., што КПЗБ закідвала ўсе дарогі ў Ваўкавыскім павеце адозвамі. Па ліквідацыі КПЗБ сябры яе пайшлі ў Грамаду. Не памятае добра, ці быў пры баданьні Патоцкага, хоць у судзьдзі сьледчага казаў, што быў.

Абв. Патоцкі асьведчыў, што сьведка ня быў пры баданьні прысутным і што яго бадаў іншы вывядоўца, які сам напісаў пажаданы для сябе пратакол і казаў Патоцкаму падпісаць. Калі ж Патоцкі адмовіўся, канфідэнт ударыў яго ў твар. Будучы паважна хворым, Патоцкі рашыў падпісаць, затое ў судзьдзі сьледчага прызнаць ўсю праўду, што і зрабіў.

Сьв. Паўлоўскі Янка кажа, што Патоцкі зьбіраў подпісі на бел. школу і казаў, што ў Расеі лягчэй знайсьці працу. Аб далучэньні Зах. Бел. да Расеі нічога не казаў. Быў чалавекам асьцярожным і ў ніякія-б размовы з незнаёмым паліцыянтам не ўдаваўся-б.

Судзьдзя Едзевіч: якой народнасьці сьведка?

Сьв. — польскае.

На жаданьне пракурора Раўзэ Патоцкі асьвядчае, што ён рабіў у Расеі ў 1919 і 1920 годзе: быў вучыцелем у Саратаўскай губэрніі, куды выехаў па сканчэньні школы. Па некатарым часе пакінуў працу вучыцельскую, бо яму не плацілі пэнсіі. Быў за гэта арыштаваны і звольнены толькі дзякуючы інтэрвэнцыі вучыцельскаму саюзу.

З прычыны таго, што наш карэспандэнт не дастаў ад адпаведных уладаў пропуску на час 22 дня працэсу, падаем далейшы працяг працэсу бяз гэтага дня, які пастараемся зьмясьціць у наступны нумары, узяўшы яго з польскіх газэтаў. (*Рэд*).

23 дзень працэсу Грамады 31 /III. 1928 г.

Сьв. Баран Лявон, належаў да Грамады, запісаўся дабравольна, ніхто не нагаварываў. Урад гуртка зьбіраў сяброўскія складкі, з якіх часта адсылалася ў Цэнт. Сэкр. Быў на павятовым зьезьдзе ў Саколцы, які быў разагнаны. Гурткі не раскідвалі камуністычных адозваў, ніколі ня змушалі каго небудзь сілай запісвацца ў Грамаду.

Падсуд. Тарашкевіч: можа сьведка раскажа, як адбыўся павятовы зьезд у Саколцы? Сьв. Зьезд быў адчынены б. паслом Валошыным. Прысутным быў і пас. Тарашкевіч. Паліцыя кантралявала довады асабістыя і пасьля пачала ламаць дзьверы. Тарашкевіч — а якіх дакумэнтаў вымагала паліцыя апрача довадаў? Можа сяброўскіх легітымацыяў?

Старш. Суда Аўсянка: ня можна падказываць адказаў, сьведка забыўся. Тарашкевіч, пан пракурор неаднакратна падказываў адказы... Ст. адбірае ад Тарашкевіча голас.

Сьв. Вышэцкі, пал. кажа аб дзеяльнасьці Янкі Гелды, Беламыжага і Алякс. Здашюка. Гелда нагаварываў сялян да помачы палітычным вязьням, два апошнія казалі аб патрэбе стварэньня беларускага войска ў Польшчы. Аб адарваньні ад Польшчы і аб раскідваньні камуністычных праклямацыяў, сьведка нічога ня чуў.

Сьв. Аронік, гаёвы, ведае Гелду ад 1920 году; абодва служылі ў надлясьніцтве. У 1922 г. Гелда страціў пасаду, бо агітаваў за сьпісак беларускі (№ 16) падчас выбараў у папярэдні Сойм. Падсуд. Гелда высьвятляе, што ён заўсёды захоўваўся да польскай дзяржавы лёяльна, ня вёў ніякай антыдзяржаўнае працы і з пасады ня быў звольнены за агітацыю, як гавора сьведка, а перанёсься сам, на іншую.

Сьв. Орлянчык, пал. чуў, што Гелда нагаварваў людкасьць, каб дамагалася белар. школаў. Апрача гэтага, Гелда казаў аб беларускім урадзе і аб патрэбе зьменшаньня падаткаў.

Сьв. Кэндзерскі — пал. кажа, што Гелда заклікаў людкасьць да арганізацыі, дзякуючы якой у прышлы Сойм можна будзе правесьці больш беларускіх паслоў, якія будуць змагацца за лепшую будучыню свайго народу. Апрача гэтага, дамагаўся беларускіх школаў і адабраньня зямлі ад паноў і ксяндзоў.

Сьв. Кашэўскі, пал. кажа тое самае аб падсуд. Козічу, які прамаўляў на сабраньні ў вёсцы Рагачах.

Сьв. Кунцэвіч П. належаў да Грамады, гурток у іх вёсцы нічога не рабіў, бо ўсе чакалі павятовага зьезду Грамады, які адбыўся ў Саколцы і на якім сьведка быў прысутны. Выпісваў беларускія газэты, за якія акуратна плаціў грошы. У судзьдзі сьледчага сказаў, што не плаціў, бо быў настрашаны кам. пастар. у Новым Двары Працэвічам, які, апрача гэтага, у часе лiквiдацыі Грамады парваў у яго хаце беларускі календар, і абарваў са сьцен белар. газэты, якімі была выклеяна хата. Тарашкевіч: можа сьведка раскажа, як адбыўся зьезд у Саколцы?

Сьв. Зьезд адчыніў Валошын, апрача яго быў прысутным і Тарашкевіч. Паліцыя кантралявала пашпарты і сяброўскія білеты. Унутры было ціха і спакойна. Дзьверы пачалі ламаць звонку. Пасол Тарашкевіч зьвярнуўся да прысутнага кам. пал. і прасіў яго інтэрвэнцыі. Камэндант адказаў, што гэта не яго справа...

Сьв. Працэвіч Я., кам. пастар. у Новым Двары пярэчыць таму, што ён абрываў бел. газэты са сьцен у хаце Кунцэвіча. Яму здаецца, бо добра не памятае, што гэта зрабіў у яго прысутнасьці, або сам Кунцэвіч, або яго жонка. Кароткія паказаньні сьведак Крыштафовіча, Лявіцкага, Пігеля, Смокіша датычуць асоб абв. Зданюка, Беламыжага і нічога канкрэтнага да справы ня ўносяць.

Сьв. Ментусь—пал., быў прысутны на мітынгу пасла Валошына ў Ячне, на якім Валошын сказаў, што польскі ўрад робіць камуністымі ўсіх, хто мае пустыя жываты.

Сьв. Г. Залеўскі—пал. быў пры рэвізіі ў Валошына і бадаў старшыню пав. кам. Грамады ў Саколцы, Альшэўскага, які сказаў, што інструкцыі ў справе закладаньня гурткоў атрымліваў ад Валошына і Цэнтр. Сэкр. Быў прысутным пры адчыненьні валізы, забранай з памешканьня Валошына, але не памятае, ці сьведкі пры гэтым былі спачатку, ці іх паклікалі, пазьней, як ужо ўсё было зроблена.

Сьв. Жуковіч Язэп, канфідэнт, сачыў Валошына і быў на мітынгах, скліканых апошнім у Ячне і Саколцы. Зьезд у Саколцы 21-XI 26 г. разагнала вясковая людкасьць, якая пачала ламацца ў дзьверы... На мітынгах Валошына акружала „bojówka", у склад якой уваходзіла каля 5 чалавек, з якіх некаторыя мелі ляскі (палкі)!... Бадаў Гелду, які прызнаўся, што заданьнем Грамады было згарнуць у гуртках як найбольш сьвядомых беларусаў, каб пасьля можна было лягчэй дабіцца зьдзейсьненьня найпрымітыўнейшых жаданьняў беларускага народу шляхам барацьбы ў Сойме. Тарашкевіч: дзе сьведка быў падчас зьезду? Сьв.—на другой старане вуліцы, напроці шопы, у якой адбываўся зьезд. Тарашкевіч: ці была паліцыя і як яна рэагавала на ламаньне дзьвярэй? Сьв.—паліцыя была, але яна не рабіла нічога...

Сьв. Аношка — сэкрэтар гуртка, старшынёю якога быў Гелда. Апошні аб адарваньні ад Польшчы ніколі нічога не казаў. Сябры выпісвалі газэты і сабралі на арыштаванага жыхара іх вёскі Амрочыка, які таксама быў сябрам гуртка— 2 зл. 50 гр. Упярод на ведаў, а цяпер ведае, што Грамада была партыяй камуністычнай.

Адв. Дурач: скуль сьведка гэта ведае?

Сьв. — паліцыя так кажа.

Сьв. Галаўчынскі, пал., служыць у павеце Сакольскім ад жніўня 1926 г. Гурткі арганізаваў там Гелда, які атрымліваў інструкцыі ад Валошына. Людзнасьць запісвалася ахвотна, бо мэты былі добрыя. Гелда імкнуўся да стварэньня Незалежнай Беларусі, да аканаваньня права беларусаў самаўрадаў і да падзелу зямлі паміж малазямельнымі і беззямельнымі. Зданюк Ал. быў старшынёю ў Астраву і казаў больш-менш тое самае, што і Гелда. Абв. Козіч часта выяжджаў да Горадні і належаў да КПЗБ. Далей кажа аб мітынгу ў Саколцы, на якім прамаўляў Валошын. Зьмест прамовы такі: у Польшчы многа паліцыі і войска, суды несправядлівыя судзьдзі—каты. І гэты сьведка таксама бачыў каля Валошына „bojówkę", якая складалася з пяці асоб, маючых ляскі... (кіі!).

Абв. Козіч асьведчае Суду, што пратакол, які з яго сьпісалі ў паліцыі—фальшывы, бо ён быў змушаны да падпісаньня. У сваім часе ён падаў аб гэтым заяву да Пракурора Акружнага Суда ў Беластоку.

Абарона сьцьвярджае цэлы шэраг нязгоднасьцяў паміж паказаньнем сьведкі ў судзьдзі сьледчага і цяперашнім, якія датычуць найгалоўнейшых закідаў, робленых ім абв. Гелдзе, Козічу, Зданюку...

Тарашкевіч: колькі разоў Валошын быў у Саколцы? Сьведка не ведае.

Тарашкевіч: асьведчаю Суду, што ў Саколцы быў толькі павят. зьезд гурткоў. Тыя сьведкі, якія называлі гэты зьезд мітынгам, сьвядома ілгалі.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Звальненьне былога ксяндза Оконя.

Па двухмесячным пабыце зволынены з турмы былы ксёндз і пасол Аўген Оконь. Звольнілі Оконя пад залог 500 зл. Выходзячы з турмы, Оконь асьведчыў турэмным уладам, што шчыра выракаецца сваіх пераканаваньняў, будзе шчыра супрацоўнічаць з касьцёлам і падпарадкавацца духоўным уладам.

Вось, як хутка расплываюцца „глыбокія" пераканаваньні ў духавенства, калі яны ня зьвязаны з цэлесным „благадзенствіем".

Падвышка для працаўнікоў трамваяў.

У верхнім Сьлёнску і Дамброўскім басэйне не дашло да запавяданай забастоўкі трамваяў, з прычыны павялічэньня платы трамвайным працаўнікам.

Плата павялічана ад 7 да 8 прац., хоць патроху, але памагае забастоўка.

Суд над камуністым.

Акружны Суд у Пазнані засудзіў на тры гады цяжкай турмы Мячыслава Болькевіча, за камуністычную агітацыю ў войску і за ўсілаваньне дастацца на абшары амуніцыйных установаў у цытадэлі (крэпасьці).

Присуд над „турэмнымі бунтаўнікамі".

У Акружным Судзе ў Быдгошчы разглядалася справа вязьняў, прабаваўшых, у сваім часе, уцячы з турмы. Чатырох правадыроў засуджана на далейшыя два гады вастрогу, двух другіх па году.

Добры падарунак бедным людзям: па два гады бясплатнай кватэры.

Усюды крадуць.

Варшаўскі „Głos Prawdy" падае аб крадзяжах у варшаўскіх мястовых інстытуцыях і на фабрыках.

У вадаправоднай і каналізацыйнай дырэкцыях выяўлены сыстэматычны крадзеж дзерава.

На Электоральнай вуліцы ўкрадзена скрыня з каўчукавымі (рэзінавымі) вырабамі, уласнасьць дырэкцыі мястовых трамваяў.

У „Pocisku" (дзяржаўная фабрыка амуніцыі) украдзена масенжнае начыньне.

У фабрыцы брацьцяў Яблкоўскіх выкрыта віноўніка сыстэматычнае крадзежы бронзы. У арыштаванага знойдзена некалькі кіляграмаў цэннага мэталу.

Але не ў аднэй толькі Варшаве гэткія спрытныя. Не бракуе іх прадстаўнікаў і на нашых „Крэсах". Напрыклад, жалезнадарожны кассір Язэп Трапша ўкраў вялікую суму грошай і ўцёк у нявядомым кірунку. Праўдападобна гэта ёсьць былы пасол у т. з. Віленскі Сойм, які разам з другімі злучваў нашы „Крэсы" з Польшчай, бяз ніякіх „агаворкаў". Адзін з гэткіх паслоў, Антон Швабовіч, па прылучэньні да „мацеры" ўмёр паўгалоднай сьмерцяй, пакідаючы ў нэндзы нешчасьлівую сям'ю.

Але яго сябра Язэп Трапша, відаць, быў „параднейшы", калі даў сабе рады „прылучыць" на вечныя часы і скарбовыя грошы да... сваей зладзейскай кішэні. Ці хапіла ў яго спрыту, каб выкарыстаць іх — невядома, бо ёсьць чуткі, што ён прабаваў „злучыцца" з Літвой, але „апёкся" на гэтай новай спробе.

Вялікі крадзеж у Бельску.

Да памешканьня купца Шоппера дасталіся зладзеі і пакралі гардэробу і другія рэчы, на суму сто тысяч злотых. Апрача гэтага, украдзена 60 даляраў, некалькі сот чэскіх каронаў і 13.000 злотых.

Працавітасьць касовых зладзеяў у Варшаве.

Па статыстычным даным, касовыя зладзеі ў сакавіку г. г. даканалі ў Варшаве замаху на 7 незгараемых касаў, з якіх 4 разьбілі, адну адчынілі падробленымі ключамі, а дзьве ўшкодзілі, бо былі або спалоханы кім, або ня мелі адпаведных прыбораў. Пажывай зладзеяў стала агулам 45.104 зл.

У параўнаньні да сакавіка 1927 г., аказваецца ў сакавіку г. году адным замахам болей.

Дэнтыстычная „афэра" ў Львове.

У Львове выкрыта сэнсацыйнае фальшаваньне, у якім замешаны асобы, займаючыя вельмі высокія становішчы.

Справа ў тым, што асобы, ня маючыя за сабою ніякіх кваліфікацыяў, атрымлівалі за дужыя грошы („grube pieniądze" „Rzeczp. 102") дэнтыстычныя канцэсіі, якія адмоўлівалі выкваліфікаваным (спэцыялістам) дэнтыстам (зубным доктарам).

Гэта, як відаць, адзін з частых клясычных прыкладаў, што ў Польшчы адраджэньне кішэні, ідзе шмат шпарчэй за „маральнае адраджэньне".

Уцечка „дэфраўданта".

Агент Пазнанска-Варшаўскага Таварыства Забясьпечань у Цешыне (Шлёнск), Куфа, ўцёк у нявядомым кірунку, спаняверыўшы на школу гэтага Таварыства некалькі тысячаў злотых.

Таксама свайго роду „санацыя".

Бандыцкі напад.

Каля Расьціміна на асаду нейкага Сіга напала некалькі забройных бандытаў. Зраніўшы яго некалькімі рэвальвэравымі стрэламі, бандыты прабавалі зрабаваць маемасьць. Але, дзякуючы гвалту, нарабленаму дачкой Сіга, бандыты ўцяклі, нічога не забраўшы.

„Бандытаў" і „зладзеяў", як бачым, усюды кішма кішыць, ці ня „cud" гэта?

Арыштаваньне „польскага караля".

У Сасноўцу арыштавана ўмыслова хворы, Ян Ражанскі, які абвясьціў, што ён ёсьць князь сьлёнскі і кароль польскі, Ян IV і едзе цяпер у Кракаў на каранаваньне.

Ці ня гэткае каранаваньне чакае і ўсіх, яшчэ не зварʼяцеўшых польскіх манархістаў.

Заграніцай.

III сэсія Ц. К. ССРР.

Радавае Агенства ТАСС данесла, што ў Маскве пачалася III сэсія Цэнтральн. Выкан. Камітэту ССРР. Сярод галоўных спраў на павестцы сэсіі стаяць справы бюджэту, перагляд падатку з земляробаў і г. д

Афганскі кароль едзе ў ССРР.

Весткі, пушчаныя з Лёндану, быццам афганскі кароль, заключыўшы ваенна-палітычна-гаспадарчы саюз з Англіяй, скіраваны проці ССРР, мае вярнуцца дамоў, абмінуўшы ССРР, — ня спраўдзіліся. Перадусім характар самай умовы Афганістану з Англіяй — значна раздуты лёнданскімі інфармацыямі. Ніякага афіцыяльнага трактату, як паведамляюць з таго-ж Лёндану, асьцярожны Аманулах з Англіяй не падпісаў. Англія атрымала толькі дазвол на ўвоз у край аружжа, на трыманьне ў сталіцы Афганістану спэцыяльных ваенных рэчазнаўцаў — пры англійскай місіі, а таксама пэўных канцэсіяў у галіне паветранай камунікацыі. Праўда, і гэтыя здабычы англійскага ўраду—вельмі важныя—у параўнаньні з тым агульным байкотам, які дагэтуль тасаваўся ўрадам Афганістану да ўсяго англійскага — пад уплывам радавых дарадцаў у Кабуле. З гэтага ўсяго ясна і тое, што—ніякай зьмены згары апляванага маршруту (плян падарожы) афганскі кароль у Лёндане не зрабіў: ён ужо выехаў з Лёндану ў Нямеччыну, адкуль у хуткім часе—праз Польшчу — мае выехаць у Маскву. Масква пэўне-ж будзе мець больш клапоту—пасьля лёнданскай візыты Аманулаха — для ўтрыманьня тэй самай прыязьні з Афганістанам, якая існавала дагэтуль. Абодва сьмяротныя ворагі хочуць перадусім паказаць патрэбнаму абодвум суседу сваю ваенную сілу — каб выбраў, добра, з кім мае быць у прыязьні. Трэба думаць, што спрытны азіяцкі валадар будзе браць з абодвух бакоў усё, што толькі дасцца, але таксама спрытна ўтрымліваючы поўны нэйтралітэт паміж імі,—сьцерагучы ад вайны паміж імі свой край, які пэўне ад вайны пацерпіць больш за ўсё...

Англійскі эканаміст Кэйнс у ССРР.

Ведамы англійскі эканаміст Кэйнс, прыхільнік ССРР, прыехаў у Ленінград, дзе паміж іншым заявіў, што—калі на бліжэйшых выбарах перамогу здабудуць работнікі і лібэралы, тады новы англійскі ўрад зараз-жа ўзнавіць нармальныя дыплёматычныя зносіны з Радамі.

* * *

Мы к сьвету ўзьляцелі...
І шкло ўкруг яго напаткалі...

М. Багдановіч.

Прыльнуўшы да крат, каб пазабыцца трошкі,
Я слухаў, як сьціхаў вастрожны стогн,
То... пазіраў на двор, пяшчаныя дарожкі,—
Як раптам данясеў ка мне раяльны тон.

* * *

І ўспомніў я той час, калі з магутнай верай
Уступалі мы ў жыцьцё са сьмеласьцю ў вачох,
А шумны, гучны вальс нас ап'яняў бяз меры,
Дзесь адбіваючыся дробна ў дамох.

Х. Ільляшэвіч.

Каб толькі год адзін.

Каб год адзін! ды год вясёлы і шчасьлівы!
Каб толькі год адзін!... год радасьці, свабоды—
Аддаў-бы за яго ўсе маладыя сілы,
Аддаў-бы за яго усё сваё жыцьцё,
Аддаў-бы за яго бяз жалю і бяз шкоды—
Усё, усё...

Каб год адзін! год сьветлы, год бясхмарны,
У якім, за ночай мар, ня йшоў-бы, як звычайны,
Тужлівы дзень за днём, дзень — ноч і бяз канца і бяз меры,
Як каламутная вада, як восеньню туман, так аднастайна-шэры,—
Каб сьветлы год! год новай працы, новага жыцьця,—
Аддаў-бы за яго я ўсё сваё жыцьцё,
Аддаў-бы радасна, ахвотна, як дзіця—
Усё, усё...

Каб толькі год адзін! ды год бяз жалаваньняў,
Бяз плачаў стрыманых у поўначнай цішы,
Год бяз ілжы, ахвяраў, заблуджаньняў,
Бязьмернага шчасьця смагнучай душы;
Каб толькі выліць усё, што гэтак моцна рвецца
З юнацкае душы, мышленьня, любячага сэрца,
Усе свае імкненьні, думкі, усё каханьне,
Каб толькі выліць усё, усё дазваньня—
І не хачу ўзамен вякоў існаваньня!
Нашто тым жыцьцем даражыць,
У якім адны ахвяры ды мучэньня—
У якім так цёмна, немагчыма жыць?!...

Каб толькі год адзін! год адпачынку—сьвята працы,
Каб толькі год пажыць, як зьнікнуць „Беларускія палацы"—
Яе фізычныя й духовыя вязьніцы —
Я не хачу вякоў існаваньня:
Нашто таму жыцьцё сваё цаніць,
У якім ён толькі чорны вол
І мусіць больш вала цярпець бізун і кол
Усё жыцьцё... і ўсё рабіць... рабіць?!

Алесь Ц.

Мо' і тут „Грамада"?

Чытаючы ў віленскіх польскіх газэтах прэсавыя справаздачы з працэсу „Грамады" у Вільні, навет малаграматнаму папольску адразу кідаецца ў вочы вялікая тэндэцыйнасьць і староннасьць гэтых газэтаў у асьвятляньні фактаў працэсу, што таксама пацьверджвае ў № 7 з 15. IV. с. г. пачцівая польская часопісь „Przegląd Wileński".

Два гады крычалі манархістычнае „Słowo" і эндэцкі „Dziennik Wileński" на чале з „дэмакратычным" „Kurjer'ам Wileński'м", выдумляючы нястворыныя рэчы на „Грамаду". Быццам „Грамада" арганізавала паўстаньні, заклікала да чыннага апору ўладам, грамадзіла склады зброі і т. п. хлусьню. Дык і цяпер, калі адбываецца працэс, гэтыя газэты любяць часам перакруціць факт, або дапісаць лішняе слаўцо на некарысьць абвінавачаных, як гэта напрыклад было з сьведчаньнем сьведкі Леснабродзкага. Трэба-ж вырабляць агульную апінію аб тым, што ўсё, што гэтыя газэты трубілі аб „Грамадзе", чысьцюсенькая праўда, а таксама трэба-ж прыгатаваць польскае, а часткай і беларускае грамадзянства, да будучага судовага прыгавору.

Пакуль яшчэ перад судом праслухана толькі адна частка сьведкаў са стараны абвінавачаньня, складзеная ўбольшасьці з шпікоў, паліцыянтаў і афіцэраў. Устрымаемся ад дыскутаваньня над працэсам, хоць ужо шмат чаго можна было б сказаць аб ім і будзем цярпліва чакаць яго закачэньня.

Амаль кожны выпадак, які час ад часу здараецца ў Заходняй Беларусі, польская прэса, а асабліва віленская, зусім беспастаўна прыпісвае „Грамадзе" і пры тым ні з таго, ні з сяго нападае на беларускую прэсу і беларускіх дзеячоў.

Да якіх дзікіх абсурдаў часам даходзіць, прыпомнім толькі адзін факт, калі ў мінулым годзе вядомы беларусажэр Обст у „Dzienniku Wileńskim" пісаў, што маючыя выйсьці тагды ў сьвет новая беларускія часопісі „Заранка" і „Саха" гэта—часопісі камуністычныя (!) Гэтакіх жартаў навет і „Маланка" не зьмяшчае. Падумайце толькі: часопісь дзіцячая і часопісь чыста гаспадарская—камуністычныя!?.

Ужо год выходзяць гэтыя часопісі і сам Обст можа іх прачытаць і пераканацца, якія дзікія мазгі ён мае.

Учора ў адной варшаўскай польскай газэце я прачытаў аб адным здарэньні, якое сталася каля Лодзі. Ах, якая шкада, што каля Лодзі (ў Польшчы)! Каб гэта здарылася ў нас, на Беларусі Заходняй, дык-бы віленскія польскія газэты мелі-б аб чым пісаць цэлы тыдзень, а мо' навет і месяц. Тут бы зараз была вінавата „Грамада", бальшавікі, „państwo ościenne"...—Газэты паднялі-б крык на ўвесь сьвет, прызывалі-б уладу да surowych рэпрэсіяў і т. п. І Бог ведае, чым-бы гэта скончылася? Але сталася гэта ня ў нас, а ў Польшчы, дык віленскія польскія газэты—маўчок...

А сталася вось што. Падаю дакладна:

„Зьлінчаваньне*) паліцыянта.

Лодзь. 13 красавіка.

Першага дня сьвятаў Вялікадня мястэчка Борыславіцы-Касьцельныя каля Колаў было сьведкам бурлівага выпадку.

У часе набажэнства тутэйшыя хлопцы пачалі страляць „на віват". Паліцыянт Баляслаў Зялінскі казаў аднаму з хлопцаў Раману Аўгустыняку ўстрымацць стралянііну і, бачучы адпор, схапіў яго за каўнер. Аўгустыняку, аднак, удалося вырвацца з рук паліцыянта, а натаўп, акружаючы касьцёл, стаў па старане хлопца, дамагаючыся, каб не арыштоўваць яго. Заатакаваны каменьнямі Зялінскі выстраліў дзеля страху. Натаўп заатакаваў яго, сілкуючы забіць. На чале натаўпу сталі пажарныя, якія мелі разам з Зялінскім пільнаваць парадку. Даведзены да немагчымасьці Зялінскі, у абароне свайго жыцьця, стрэліў, цяжка ранячы двох пажарных. Раз'юшанае сялянства ўдарыла яго калом, пасьля чаго Зялінскі заваліўся ад спадаючых на яго ўдараў. Ад няміну чай сьмерці выратвала падбегшая паліцыя. Змагаючагася са сьмерцяй Зялінскага адвезьлі ў шпіталь. Некалькі падбухторнікаў арыштавана".

„Kurjer Poranny" № 103.

Такіх выпадкаў а ні за часаў „Грамады", а ні пасьля яе зьліквідаваньня на Заходняй Беларусі ня было.

Падумайце толькі: w rdziennej Польшчы, дзе „Грамадой" навет ані пахнула, натаўп забівае паліцыянта. Хлопцы страляюць „на віват" з рэвальвэраў (скуль склад зброі?) і... то навет дзе? — каля касьцёлу на Вялікдзень!...

Ну і ці ня можа быць пасьля гэтага гэтак званы „канец сьвету"?!

Як вы думаеце?... М.

*) Зьлінчаваньне—самасуд.

Мілітарызацыя—у выніку „разаружэньня“

Як ведама, на апошняй канфэрэнцыі ў Жэнэве ў справе разаружэньня—вялізарнай большасьцяй дзяржаў былі адкінуты — ня толькі радыкальная прапазіцыя радавага ўраду аб скасаваньні ўсіх і ўсялякіх азброеньняў дзяржаў, але навет прапазіцыя нямецкай дэлегацыі—аб тым, каб безадкладна прынамся распачаць працу па склікаваньні вялікай міжнароднай канфэрэнцыі ў справе разаружэньня, не чакаючы, пакуль бесканечныя „падрыхтаваўчыя“, але нічога ня здольныя падрыхтаваць, камісіі ды камітэты скончаць сваю працу, з якой, як паказала сэсія апошняй камісіі, нічога ж ня выходзіць.

Нямецкая прэса з гэтага правалу справы разаружэньня—галасамі азброеных да зубоў вялікіх і невялікіх дзяржаваў — робіць сумны, але няўхільны вывад: гэткая пастанова азброеных дзяржаваў маральна звальняе ўсе іншыя — разброеныя пасьля міру дзяржавы ад усялякіх абавязкаў разаружэньня. Наадварот: яна дае ім права—нароўні з іншымі дзяржавамі—да збраеньня.

У тым-жа сэньсе толькі-што выказаліся ў Маскве — на штогоднім кангрэсе Азіахіму радавы прэм'ер Рыкаў і ваенны міністар ССРР Варашылаў. Рыкаў сказаў, што радавы ўрад пастанавіў праводзіць—бязумоўную мілітарызацыю краю, на што ССРР змушаны ўсім тым, чаго наслухалася радавая дэлегацыя на апошняй „разбраенчай“ канфэрэнцыі ў Жэнэве.

Пасьля Рыкава выступіў Варашылаў, які яшчэ выразьней заявіў: прабавалі мы разброіць імпэрыялістаў у Жэнэве, выказаўшы самі найлепшыя жаданьні сусьветнага разбраеньня. Але нашы прапазіцыі спаткаліся з злой воляй і злоснай крытыкай з боку імпэрыялістычных дзяржаваў. Дзеля таго мы ня маем іншага выхаду, як бязумоўная мілітарызацыя Саюзу.

Літвінаў — аб рэзультатах канфэрэнцыі ў справе разаружэньня.

„Известия“ публікуюць заявы Літвінава, які сьцьвярджае, што ён — вельмі здаволены рэзультатамі апошняй канфэрэнцыі ў справе разаружэньня. Праўда, радавыя праекты былі адкінуты ці адкладзены „пад сукно“. Але канфэрэнцыя, ня даўшы ніякіх пазытыўных вынікаў, ясна паказала затое, хто з дзяржаваў зьяўляецца ворагам разаружэньня. І гэта зроблена як раз радавай дэлегацыяй, якая і ў далейшым будзе прымаць бліжэйшае ўчасьце ў разаружаючых працах дзяржаў.

Японскі ўрад, Чанг-Тсо-Лін і Рады ў Манчжурыі.

Токійскі карэспандэнт „Кур. Варш.“ падае надзвычайна цікаўныя весткі аб новым збліжэньні паміж Японіяй і Радамі, дыктаваным ведамым японскім палітыкам баронам Гото, які толькі-што вярнуўся з ССРР, дый распачаў вялікую агітацыйную кампанію ў краі—на карысьць амаль не саюзу з С.С.Р.Р.

Барон Гото чытае лекцыі аб сваіх уражаньнях з падарожжы па ССРР. Лектар параўноўвае расейскіх бальшавікоў з старымі японскімі самураямі-закладчыкамі японскай дзяржавы. Засьцерагаючыся, што ён сам зусім не радыкал, барон Гото кажа, што кажа толькі праўду, калі сьцьвярджае вялізарныя пасьпехі новай гаспадарчай палітыкі і культурных дасягненьняў Радавых рэспублікаў. Карэспандэнт лучыць усю агітацыю барона Гото з вялікім зваротам японскай палітыкі да бліжэйшага паразуменьня з Радамі. Бо-ж паважная японская прэса ў апошні час усьцяж падчырківае супольныя інтарэсы Японіі і ССРР у Манчжурыі, прапануючы згоднае супрацоўніцтва абодвух у гэтым краі. Японская прэса адкрыта кажа, што Японія ня можа абыйсьціся без манчжурскага лесу і збожа, дык — „ня маючы фармальнага права на іх, Японія павінна будзе бараніць свой фактычны стан валаданьня ў Манчжурыі“... Але—на шляху да гэтага апанаваньня Манчжурыі Японіяй, як абураецца японская прэса, стаў... ніхто іншы, як яшчэ нядаўна пакорны наймітчнік японскі — Чанг-Тсо Лін, які страціў у апошні час цалком „даверра Японіі“! Дык урад гр. Танакі пастанавіў — зблізіцца з Радамі, каб разам з імі бараніць свой стан валаданьня ў Манчжурыі—„проці гэтага безнадзейна-дурнога ідыёта“. Так непашанна выражаецца даслоўна аб нядаўнім прыяцелі Японіі — дыктатары Манчжурыі японская газэта!

Запраўды-ж — сэнсацыйны зварот усіх дасюлешніх адносінаў на Далёкім Усходзе, які можа меть вынікі вялізарнай вагі. А пакуль падчыркнем толькі,—якія-ж вялікія, відаць, апэтыты ды захватныя прэтэнзіі мае Японія на манчжурскі вялізарны край, калі выклікала навет апор з боку яшчэ нядаўна пакорнага свайго парабка — Чанг-Тсо Ліна, які нядаўна толькі гатовы быў прадаць Японіі сваю бацькаўшчыну, каб толькі дапамагла яму—дабіцца пабеды над паўдзёнымі арміямі, ды імпэратарскай улады над усім Кітаем.

Сумліўна толькі, ці знойдзе Японія на гэта саюзьніка ў ССРР!..

„Камуністычная змова“ ў Японіі.

Уздым работніцкага руху ў Японіі так настрашыў бясспрэчна панаваўшыя дагэтуль у Японіі буйна-уладніцкія клясы, што „зусім натуральна“ ня горш, як і ў іншых краёх—перад вайной ці пасьля вайны — выкрылася паліцыяй шырока арганізаваная ў краі — змова проці самых падставаў японскай дзяржавы. Змова, зразумела, аказалася арганізаваная камуністамі, дый—за грошы „суседняй дзяржавы“. У Японіі, як ведама, ёсьць яшчэ імпэратар Мікада, дык дурныя — былі-б тыя „камуністы“, „калі б яны не зрабілі побач з „змовай“ і — „замаху на асобу караля“. Адным словам,—усё было зроблена—як па нотах, каб... апраўдаць тыя вялізарныя дадатковыя асыгноўкі, якія выдаў урад на—павялічэньне лічбы паліцыі ў краі на 10.000 асоб.

Цяпер у Токіо рыхтуецца вялізарны працэс аб гэтай „змове“.

Акт абвінавачаньня на 150 падсудных ужо гатовы. Але пракурор заявіў, што рыхтуе такі-ж самы акт яшчэ адносна да новых 450 абвінавачаных.

Характэрна, што—ад часу выбараў, калі ўрад фактычна ўвёў ува ўсім краі амаль не ваеннае палажэньне, і цяпер яшчэ—у сьвязку з сьледзтвам у гэтай справе — улады надтрымліваюць нейкі „выняткавы стан“: насяленьне абмежавана ў вольнасьці слова, друку, сабраньняў і г. д. Чаму гэта? Таму, што—выбары не далі ўраду пажаданай большасьці ў парляманьце — ня выявілі сільнай апоры ўраду у краі, але, маючы фактычную ўладу ў сваіх руках, урад ня толькі—ня хоча выпусьціць яе з рук, але наадварот: хоча—ня гледзячы ні на што — наперакор незадаволеньня ў краі—яшчэ „ўсіліць“ яе тасаваньнем выняткавага стану, які дае адміністрацыі і паліцыі надзвычайныя правы. Такім чынам, у Японіі, як шмат дзе інш у сьвеце, ідзе ведамы працэс фашызацыі дзяржаўнага жыцьця: прынцыповай перавагі выканаўчай улады над заканадаўчай, ці ўлады найбагацейшых над рэштай краю.

„Камуністычны працэс“ і зьяўляецца толькі аднэй з праяваў гэтага працэсу.

Барацьба з „камунізмам“ у Японіі.

Як ведама, толькі-што адбыўшыяся выбары ў японскі парлямант далі японскай работніцкай клясе аж... 8 паслоў. Гэтага было даволі, каб бясспрэчна пануючы ў краі ўрадавы блёк фэадальнай арыстакратыі і буйнейшай буржуазіі, страшэнна ўстрывожыўся і пастанавіў прыняць экстрэныя меры. Край абвешчаны быў — „пад пагрозай камунізму“. Урад зараз-жа павялічыў на 10.000 паліцэйскую армію ў краі. А вось, апошняя тэлеграма з Токіо (англійск. агенцтва) кажа, аб тым, што гэтая ўзмацаваная „армія“ ўжо пачала працу. На ўсім абшары Японіі — у местах і на вёсцы — пачаліся вобыскі і арышты камуністаў. Урад пастанавіў — пазбаўляць права навучаньня прафэсароў, якія выказваюць сымпатыі да „камунізму“, а таксама — распусьціў шэраг студэнцкіх арганізацыяў, „падазроных“ з боку такіх сымпатыяў. Навет карэсп. такой газэты, як „Кур. Варш.“, піша з Токіо, што апошнія выбары японскі ўрад рабіў—тасуючы такі тэрор, якога яшчэ ня ведала дагэтуль Японія. Але, ня гледзячы на гэта, урад мае вельмі сумліўную большасьць у парляманьце. Аднак-жа ўрадавая партыя зусім ня мае намеру ўступаць улады апазіцыі. Дык — ці гэтым тэрорам адносна работніцкай клясы ўрад ня мае намеру прыхіліць да сябе буржуазную апазіцыю. Ня трэба дадаваць, што такая палітыка ўраду толькі прысьпяшае ўзрост клясавай сьвядомасьці і варожых настрояў сярод работніцкіх сялянскіх масаў.

Амэрыканскі праект „вечнага міру“.

Пасьля прадуступнай перапіскі міністар загран. спраў Амэр. Штатаў Кэллог запрапанаваў афіцыяльна ўсім вялікім дзяржавам: Англіі, Францыі, Нямеччыне, Італіі і Японіі (зразумела ССРР пакуль-што выключаны) — прыступіць да перагавораў у справе заключэньня супольнага трактату—аб выключэньні назаўсёды ўсялякай вайны з узаемных адносін. Гэткім чынам Амэрыка прапануе толькі вялікім дзяржавам такі трактат, маючы гэткім чынам стварыць нейкі хаўрус міру вялікіх дзяржаў, у якіх, можа, будуць за тое разьвязаны рукі адносна да... невялікіх.

Асабліва перастрашылася гэтым амэрыканскім праектам „вечнага міру“ Францыя, якая зараз-жа зьвярнулася да ўсіх іншых вялікіх дзяржаваў з нотай, у якой заклікае іх—пачакаць з адказам на амэрыканскую прапазіцыю—да атрыманьня ад францускага ўраду—новага—францускага праекту таго-ж „вечнага міру“ і хаўрусу дзяржаваў. У сваім праекце францускі ўрад, як пішуць газэты, мае зрабіць засьцярогі: 1. Трактат маюць права падпісаць ня толькі вялікія, але і невялікія дзяржавы, 2. Новы трактат не павінен нарушаць папярэдніх трактатавых абавязкаў дзяржаў, 3. Трактат, выключаючы вайну, як спосаб нацыянальнай палітыкі, не павінен выключаць патрэбаў нацыянальнай абароны, якая—ведама-ж—часам патрабуе... вайны.

Што пасьля ўсіх гэтых засьцярогаў з боку Францыі астанецца ад амэрыканскага „шляхотнага“ праекту, няведама.

Сэнсацыйная заява Радзіча.

На супольным кангрэсе харвацка сялянскай партыі з сэрбскімі „незалежнымі дэмакратамі“ Радзіч (павадыр харватаў) востра атакаваў Мусоліні, які — яўна рыхтуецца да вайны — у мэтах апанаваньня Альбаніі. Радзіч цьвердзіў, быццам Мусоліні прабаваў грунт паміж іншым у радавага ўраду, — каб нахіліць яго да нэйтралітэту ў выпадку вайны з Югаславіяй. Але быццам атрымаў ад Масквы адмову. Радзіч, з свайго боку, радзіць югаслаўскаму ўраду—проці італьянскіх намераў—стварыць паразуменьне між Югаславіяй, Баўгарыяй і ССРР, якое зьяўляецца—палітычнай неабходнасьцяй у тых варунках, у якіх апынулася Югаславія.

Цікаўна зьвязаць гэтую прамову Радзіча — з тым зьездам балканскіх дыпляматаў, які наладзіў у Рыме Мусоліні.

Байкот англійскіх тавараў у Індыі ня спыняецца.

З Калькуты паведамляюць, што проціанглійскі рух у краі расьце ўсьцяж. У апошнія дні парлямант у Бэнгаліі прыняў пастанову, якой абвесьціў абавязковы байкот англійскіх тавараў, асабліва ўсялякай тканіны.

А ведама, як англійцы баяцца як раз гэтага таргова байкоту — горш навет, як усялякіх паўстаньняў, якімі зручна карыстаюцца толькі дзеля далейшага паняволеньня краю.

Нямецкі камуніст Отто Браун уцёк з турмы.

З бэрлінскай турмы надзвычай сьмелым спосабам звольнены відны сябра нямецкай камуністычнай партыі Отто Браун. У часе пабачаньня Браўна з нявестай 4 азброеных людзей здолілі ўварвацца ў пакой, накінуліся на 2 прысутных асобы з вастрожнай адміністрацыі, а ў часе калатні ды суматохі Браўн з нявестай здолелі ўцячы. Уцяклі і ўсе яго таварышы, апрача аднаго, які папаўся ў рукі паліцыі. Уся паліцыя настаўлена на ногі, каб знайсьці Браўна. Але дарма. Цікаўна, што аружжа, якім былі азброены замахоўцы, аказалася—ненабітым...

Нямецкія лётнікі першыя пераляцелі акіян—з Эўропы да Амэрыкі.

Два нямецкія лётнікі, выляцеўшы з Эўропы ў Амэрыку праз Атлянтыцкі акіян, апынуліся на малым востраве ля Канады. Такім чынам немцы першыя пераляцелі акіян з Эўропы ў Амэрыку, што дагэтуль не ўдавалася — ані французам, ані англійцам. Італьянцы яшчэ толькі зьбіраюцца.

„Блёк нацыян. меншасьцяў“—на выбарах у нямецкі парлямант.

У Нямеччыне, як ведама, Рэйхстаг (парлямант) — ужо распушчаны і пачаўся выбарны час. Як і ў Польшчы, нацыянальныя меншасьці стварылі ўжо, як паведамляе ПАТ, выбарны блёк. Найбольш лічная меншасьць у Нямеччыне — польская, дык з яе пачыну і паўстаў блёк; польскія кандыдаты маюць стаяць на чале—як дзяржаўнага, так і акружных сьпіскаў. Толькі трэція і далейшыя мейсцы пакінуты — датчанам, лужычанам і фрызам. Вельмі лічныя ў Нямеччыне жыды зусім ня лічаць сябе ў краі „меншасьцяй“, — ня маючы ніякіх заграні́чных „асьпірацыяў“, карыстаючыся бясспрэчна ўсімі правамі грамадзян, дык і лічучы сябе нягоршымі нямецкімі грамадзянамі, чым самі немцы.

Цікаўна падчыркнуць, што палякі ў Нямеччыне самі арганізуюць такі самы выбарны блёк, які яны ў Польшчы (навет паны пэпээсы) лічаць, як ведама, праступленьнем нелеяльнасьці адносна да дзяржавы. Даволі папулярная ў нашыя культурніцкія часы „этыка“.

Лёс польска-нямецкіх перагавораў — у справе гаспадарчага трактату.

Як ведама, польска-нямецкія перагаворы ў справе заключэньня таргавага трактату, распачаўшагася з добрай воляй з абедзьвюх старон, пасьля сталі на мертвым пункце і дагэтуль ня могуць з яго скрануцца. Справа ў тым, што гаспадарчаму паразуменьню перашкаджаюць некаторыя „палітычныя“ вымаганьні з боку нямецкага ўраду. Адно з такіх палітычных дамаганьняў датычыць правоў нямецкіх грамадзян сяліцца ды займацца таргоўляй і промысламі ў прыгранічных мяйсцовасьцях на польскім баку. Польскі ўрад выдаў сьцяг распараджэньняў, вельмі значна абмяжоўваючых гэтыя правы немцаў у гэтым пасе. Нямецкая дэлегацыя заявіла, што няма сэнсу заключаць таргові трактат з Польшчай, пакуль існуюць гэтыя забароны нямецкім грамадзянам займацца таргоўляй у Польшчы. Польская дэлегацыя ўперлася на сваім. Тады нямецкі ўрад прыпыніў далейшыя перагаворы. Пачаліся дыплёматычныя перагаворы паміж урадамі, у выніку якіх польскі ўрад зрабіў быццам пэўныя ўступкі: крыху зьмяніў адпаведныя забаронныя загады на карысьць немцаў. Але абмяжаваньні ўсё-ж пакінуты вельмі значныя, дык нямецкі ўрад ня прызнаў іх задаваляючымі і дамагаецца далейшых зьменаў, без чаго адмаўляецца прадаўжаць перагаворы. На чым скончыцца гэты спор, няведама. Мэта гэтага „гранічнага дэкрэту“, абмяжоўваючага правы немцаў на польска-нямецкім пагранічны, зусім ясная: польская ўлада хоча „разьнямеччываць“ гэты паўнямецкі край. З другога боку немцы маюць там значныя гаспадарчыя інтэрэсы, дык імкнуцца да ўтрыманьня пэўных правоў, забясьпечываючы ім гаспадарчую працу ў краі, які немцы—удадатак—ня лічаць яшчэ канчальна страчаным для Нямеччыны.

Францускі міністар пабіты на прадвыбарным мітынгу.

На мітынгу ў Бэльфоры на мініст. Публічн. Работ Тардьё (бліжэйшы супрацоўнік Пуанкарэ)—у часе яго прадвыбарнай прамовы—кінуўся б. радыкальны пасол і даў яму па твары. Мітынг скончыўся агульн. бойкай.

Фашыстаўская прэса—аб „канфэрэнцыі“.

Міланская газэта „Стампа“ раскрывае крыху сэкрэт тэй „новай палітыкі“, якую мае распачаць Мусоліні на канфэрэнцыі ў Рыме. Палітыка гэта мае—„увясьці новыя творчыя і рашаючыя элемэнты ў міжнародную эўрапэйскую палітыку. Італія мае палажыць канец тэй дыктатуры, якую тасуюць у Эўропе вялікія дзяржавы (Англія і Францыя)—праз Лігу Нацыяў. Адгэтуль у Лізе павінны іграць належную ім ролю паводле статуту, і тыя меншыя дзяржавы, якіх голас цяпер задушаны вялікімі. Дарадцам і павадыром гэтых меншых дзяржаваў і хоча быць у Лізе, ці па-за Лігай Мусоліні. Ліга Нацыяў павінна быць выкарыстана цалком—у інтарэсах гэтых меншых дзяржаў. Ліга Нацыяў павінна быць выкарыстана цалком—у інтарэсах гэтых меншых дзяржаў. Ліга Нацыяў павінна скасаваць, ці аблягчыць тыя бязпраўі і крыўды, якія зроблены некаторым меншым дзяржавам міравымі трактатамі (чытай: Вэнгрыі). Апрача таго, Ліга павінна — пераглядзець справы падзелу мандатаў на калёніі — на карысьць тых дзяржаваў, што былі пры першым падзеле пасьля вайны скрыўджаны—(чытай: Італія ў першую чаргу, а пасьля можа і—Нямеччына).

І гэтая праграма „рымскай канфэрэнцыі“, высуваная міланскай газэтай, скіравана проці Францыі, якая дагэтуль лічылася ў Лізе абаронцам меншых дзяржаваў, будуючы на гэтай сваей ролі ў Лізе сваю гэгемонію ў Эўропе.

Замах на італьянскага караля і на Мусоліні.

На жыцьцё караля і Мусоліні, якія ехалі на адчыненьне выстаўкі і вялікага кірмаму ў Мілане, зроблены бомбавыя замахі. „Пякельная машына“, настаўленая на караля, узарвалася, але кароль уцалеў з сваей сьвітай; але замест яго забіта 15 асоб і 50 ранена. Бомба, настаўленая на Мусоліні, была ў часе пгледжана, дык ня выбухнула; арыштаваны і замахоўца, які сядзеў у крыёўцы ля электрычнага дроту.

Як ведама, эміграцкая італьянская прэса цьвердзіць, што Мусоліні ад часу да часу загадывае сваім агентам „рабіць замахі на яго жыцьцё“, каб даводзіць усьцяж народу, што яго Мусоліні ахоўвае сам Бог!

Адраджэньне „фэадалізму“ ў фашыстаўскай Італіі.

Франц. прэса зьмяшчае запраўды непадобныя да веры весткі аб тым, што дазваляюць сабе рабіць розныя асабістыя прыяцелі Мусоліні ў „адроджанай Італіі“. Цікаўны прыклад усім ім дае галосны пісьменьнік і „палітык“, адзін з першых прызнаўшы „геній“ Мусоліні—яго прыяцель Габрыэле д'Анунцыо.

Д'Анунцыо жыве сабе, як сярэдня-вечны магнат фэадал, у сваім замчышчы, лічучы сябе адначасна панам-гаспадаром і ўсей прылягаючай да яго маёнткаў акругі. Ен не прызнае агульна-дзяржаўных судоў і ўладаў: ён сам робіць суд і расправу—у сваіх і чужых справах. Калі нядаўна сьледчы сьдзьдзя прыехаў да яго (гэта—замест таго, каб—паклікаць пана магната да сябе ў камэру...) — у справе... спэкуляцыйнай апэрацыі слаўнага паэта, д'Анунцыо—навет ня пусьціў прадстаўніка дзяржаўнай трудавой улады да сябе ў замак. Калі—яшчэ прыклад—яго сусед памаляваў сваю віллу (дом) у колер, які не падабаўся паэту-магнату, той паслаў яму загад: у 24 гадзіны перамаляваць дом на другі колер. Сусед аказаўся добрым фашыстам, дык горда адмовіў, а навет паехаў са скаргай у Рым да Мусоліні. А тым часам час „ультыматуму“ окончыўся. Д'Анунцыо надплыў да віллы суседа на сваім... ваенным караблі і бамбардыроўкай разваліў дом у грузы. Добра яшчэ, што нікога не забіў — бо ўсе ўцяклі.

Збліжэньне Грэцыі і Турцыі.

Англійская прэса з задаваленьнем сьцьвярджае рыхтуючаеся збліжэньне паміж Грэцыяй і Турцыяй. Першыя крокі на гэтым шляху — пэўне ж не без пасрэдніцтва Чэмбэрлена—зроблены былі на апошнім зьездзе дыплёматаў у Жэнэве. У сучасны мамэнт міністры заграні́чных спраў абодвух краёў вядуць супольныя нарады з Мусоліні ў Рыме, адкуль разам паедуць дамоў, высьвятляючы па дарозе ўсе спорныя справы. Англійская прэса прадбачыць, што абодвум міністрам удасцца дайсьці да поўнага паразуменьня, а навет заключыць трактат прыязьні, а мо' й саюзу між сабой, а можа — якой шматбаковай умовы—з Італіяй.

Чаму Грэцыя і Баўгарыя цягнуцца да Мусоліні.

Нямецкая прэса высьвятлае, чаму гэта грэцкі і баўгарскі ўрады раптам пачулі асаблівую прыязьнь да Мусоліні і выслалі сваіх міністраў загран. спраў у Рым на канфэрэнцыю. Справа ў тым, што—у апошнія часы ў Грэцыі і ў Баўгарыі ізноў пачаўся ўздым народнага руху проці фашыстаўскіх урадаў. У Баўгарыі набірае сілы ізноў раздушаны пару гадоў таму ўрадам Цанкова магутны сялянска-вызвольны рух, які ў працягу некалькі гадоў трымаў уладу ў краі. У Грэцыі, як усьцяж пішуць адтуль газэты, узмацняецца на сіле „камуністычны“ рух. Таму, чуючы сваю слабасьць у краі, урады грэцкі і баўгарскі шукаюць падтрыманьня ў „магутнага“ Мусоліні, які — датаго-ж яшчэ і пасуліў Грэцыі і Баўгарыі розных падачак, калі тыя абяцаюць датрымаць нэйтралітэту—у разе вайны Італіі з Югаславіяй.

Аддзяленьне царквы ад дзяржавы ў Турцыі.

Новы турэцкі ўрад праводзіць усьцяж важныя рэформы, якія маюць далейшую дэмакратызацыю жыцьця ў краі. Толькі-што Нацыянальнае Сабраньне прыняла ўрадавы праект закону, які касуе тое прывілеяванае становішча, якое мела дагэтуль мусульманская рэлігія і царква ў Турцыі. Артыкул

турэцкай канстытуцыі, які абвяшчаў „Іслям дзяржаўнай рэлігіяй у Турцыі", скасаваны. Адгэтуль кожная рэлігія мае роўныя правы і роўную ахову з боку дзяржаўнай улады. Апрача таго—у тым-жа сьвецкім духу — перароблены тэкст афіцыяльнай прысягі — для прэзыдэнта, паслоў і інш. — Замест слова „прысягаю" і г. д. стаяць словы: „даю слова ганору". Праект урадавы прыняты аднагалосна.—Добры прыклад даюць магамэтане-туркі эўрапэйскім хрысьціянам, якія забыліся аб тым, што Эвангельле рашуча забараняе ўсялякую прысягу, клятву Богам і г. д.

Крывавыя выбары ў м. Чыкаго.

Выбары ў самаўрад места Чыкаго (Ам. Штаты) адзначыліся асабліва крывавымі бойкамі канкуруючых партыяў. Перамагла апазіцыя, пабіўшая на выбарах партыю магістрату. У дзень выбараў — шмат раненых, некалькі забітых, паміж імі некалькі нэграў.

Наша хроніка.

По загаду Гарадзкога Старасты места Вільні сканфіскаваны № 2 газ. „Голас Працы" за наступныя артыкулы: перадавіцу—„На груньце працы", дзе падана наша прынцыповая пазіцыя нязгоды з сельсаюзьнікамі і хадэкамі, за артыкул—„Зьезд міністраў заграгічных спраў у Рыме", дзе высьвятлялася сутнасьць паездкі Залескага і другіх міністраў у Рым, ды дзьве заметкі з хронікі, паданыя на аснове вестак з газэтаў.

Зьдзіўленыя, па нашай думцы, беспадстаўнаю канфіскатаю нумару, спадзяёмся, што суд ухіліць яе.

Інтэрвэнцыі паслоў Клюбу „Змаганьня". Паслы Гаўрылік і Дварчанін зрабілі інтэрвэнцыі да адносных уладаў у Паставах і Вільні ў справе заарыштаваньня б. рэдактара „Сахі" У. Павалковіча. На правінцыі падобныя-ж інтэрвэнцыі зрабілі паслы Стагановіч і Грэцкі адносна іншых заарыштаваных.

Пэўнага адказу так і не ўдалося дастаць. Усё кругом ды навакола!

Інтэрвэнцыя пасла Д-ра І. Дварчаніна ў Гарадзенскага Старасты. На 17 г. красавіка ў Гародні быў вызначаны павятовы зьезд Т-ва Бел. Школы, але ў напошнія дні староста яго забараніў, як таксама забараніў пастаноўку спэктакляў у Гародні і Крынках. У зьвязку з гэтым пас. Д-р І. Дварчанін зрабіў інтэрвэнцыю, (запытаньне) ці гэта выходзіла ад мясцовых уладаў, ці з цэнтру і чым выкліканы гэты паступак. Заст. старасты, п. Генкель (сам староста, відаць, пабаяўся браць на сябе адказнасьць за свае чыны і словы) пасьля больш паўгадзіннае гутаркі адмовіўся даць вычэрпваючыя выясьненьні, тлумачучы бракам кампэтэнцыі (права), як заступнік старасты. Аднак прызнаў, што сам староста „нетолеранцыйны" ў адносінах да беларускага школьніцтва. Адыходзячы, пасол паведаміў, што пакідае за сабою права паставіць справу на пленум Сойму.

Зьезд Т-ва Бел. Школы ў Навагрудку. 25 сакавіка г. г. адбыўся павятовы зьезд Т-ва Бел. Шк. ў Навагрудку з мэтай перавыбару Акружное Управы, якая, амаль цалком, заарыштавана. Зьезд выбраў новую Акружную Управу ў складзе: А. Данілевіч (старшыня), Пронька, Логаш і Волька.

„Прыгатаваньне да сьвяткаваньня 1-га мая". Пад такім тытулам віленскае „Słowo" ў № 80 падае наступную вестку: „астатнія йдуць у Вільні пэртрактацыі (перагаворы) паміж лявіцовымі страннінцтвамі аб арганізацыі паходу ў дзень сьвята працоўных 1-га траўня.

Учора адбылася канфэрэнцыя паміж камуністамі і „ППС лявіцай". Ужо сягоньня відна, што ў дзень 1-га траўня выступяць дзьве ўзаемна-змагаючыяся групы: 1) камуністы з ППС лявіцай і 2) ППС (правіца) і Дробнэроўцы".

Гімназіяльныя часопісі. За апошнія часы вышлі на правах рукапісі — „Гудок", часопісь вучнёўскага гуртка Радашкавіцкай Бел. Гімназіі і „Васілёк" № 1 і 2, вучн. час. Віленскай Белар. Гімназіі.

У часопісі Радашкавіцкіх вучняў пераважае белетрыстычны матэрыял; „Васілёк" куды больш цікавы і рознабаковы, паказваючы вялікую ідэйнасьць вучняў, здольнасьць аўтараў падзвінокіх артыкулаў і даволі высокі культурны ўзровень іх.

За неадданьне на папярэдні разгляд, абодва нумары „Васілька" канфіскаваны гімназіяльнымі ўладамі.

Палітычнае забойства. 11-га г. месяца стрэлам праз вакно, забіты сэкратар Віласаўскай воласьці, Кобрынскага пав., Ян Сьнежка. Забойца—не вядомы. Падазраваюць, што забойства выканана на палітычным груньце.

Арыштаваньне „камуністаў". Па вестках польскай прэсы беластоцкая паліцыя арыштавала „западазронага" ў камуністычнай дзеяльнасьці тэхніка, Юльяна Вайсбэрга.

Усё звычайныя зьявішчы на нашых „Крэсах".

Закрыцьцё тайнай фабрыкі воцтавай эсэнсіі. У Вільні пры вуліцы Вінгры № 25 у нейкага Эфроіма Арончыка выкрыта нелегальная фабрыка воцтавай эсэнсіі. Арончык арыштаваны.

Безрабоцьце ў Беласточчыне. У прамысловай беластоцкай акрузе зарэгістравана 2,593 безработных з валакьянага прамыслу. Наагул зарэгістраваных безработных у гэтай акрузе 4,593. А колькі іх не зарэгістраваных?

Забарона хаджэньня ў „Беларускую Хатку". Штаб віленскага гарнізону, а за ім і штабы асобных вайсковых фармацыяў і ўстановаў, забаранілі вайсковым усім чыноў адведзіны „Беларускай Хаткі", гэтага лакомага спадку, які астаўся пасьля „набожчыка" Паўлюкевіча яго застуяніку—Вярнікоўскаму! Дапільнаваньне выкананьня гэтага загаду даручана вайсковай жандармэрмі і так-жа паліцыі, з прыказам, каб усіх вайсковых, затрыманых у гэтай сані, аддаваць у распараджэньне камэнданта места.

Вось дык сьвяточны падарак аслаўлянай „круцёлцы"!

Карэспандэнцыі.

З чаго створана банда Паўлюкевіча?!

(Слонімшчына-Дзярэчын).

Настаў сяньня такі сэзон, што ўсе цемныя сілы і зграі розных груганоў і подлых афэрыстаў пачалі прадаваць свае сумленьне й гонар чэснага грамадзяніна за медны грош, як подлы Юда. Вось і пачалі здрайцы працоўных Сельсаюзьнікі нашыя, Хадэкі, Чарталопшыны, Умястоўскія правакатары Гурын і мн. іншых, дохтар Паўлюкевіч, з імі былы сэнатар Багдановіч з сонмам іерееў слуг божых, і ўрэшце Янка Станкевіч, як праваднікі самае чорнае рэакцыі, апякавацца й лячыць вялікія раны працоўнага народу. Ставяць дыягнозу, пішуць рацэпт, стаўляючы вялікую дозу яду, каб працоўны народ, прыняўшы яго, адразу бяз енку і крыку раптоўна сканаў. Такою асобаю, якая прадасьць свае сумленьне, як Юда за медны грош, ёсьць у нас Антось Сончык, які жыве ў Казлоўскай вол., і мае хутар з 40 дзесяцін зямлі. Якімсь то чынам ён выбраны ў сваей вол. на раднаго і ў Павятовы Соймік. Гэты тып панаў на Паўлюкевічаўскі зьезд радных, праніксья „ідэйнасьцю" і „маральлю" свайго начальства дый па загаду яго ў Дзярэчыне аткрыў сваю крамку, пад назовам „юрыдычны аддзел пры Б. Н. Р. Шукае ўвесь час сабе ідэйнага сэкрэтара, дае 150—200 зл. ў м-ц., але дарма, прадажнае душы ня знойдзе й па сёньня. Калі аднаму з хлапцоў запрапанаваў працаваць з ім, дык той кажа—„а народ што скажа на гэта?" — „Пляваць мне на народ" адказаў „ідэаліст". Я быў у Вільні, дык там надта добра;—„піць, скольні хочаш, музыка, дармовы готэль і мн. іншага" дый маю 300 зл. у м-ц, як інструктар". Але—бедны!—ён ніяк ня мае сабе супрацоўніка і „працуе" адзін, як выгнаны вон паршывы сабака і ў канцэлярыі сваей й па месьце спацыруе, толькі ня раз бачыма ў спацыры з паліцыяй мундуровай і бяз мундураў. Мусіць, просіць даць яму „благонадежных і ідэйных" працаўнікоў. Каго паймае на вуліцы, ды дае дарма газэты і інш. літэратуры, ну а сяляне нашыя, ня дурныя, вядома, бяруць паперу, як патрэбную для ўласнага ўжытку. Многа гаворыць аб ідэйнай працы, успамінае навет моднае цяпер для ўсіх здрайцаў слова „працоўныя". Сяляне ўсе глядзяць на яго, як на ворага, і адносяцца з пагардаю, бо ведаюць, які ён прыхільнік працоўных, як перад вайною ён падстрэліў хлапца пастуха 15 г. з вёскі Сярундзі, Казлоўскае вол., і разам 7 шт. кароў застрэліў на месьце. Гадоў пару назад ён быў звольнены з пасады аб'езчыка ў казенным лесе. Сяляне добра помняць, як ён з усіх браў пудзікі пшаніцы, жыта і ўсяго, што пад руку падвернецца, ці прывязуць яму, ні ад чога не адмаўляўся, а колькі бутэлек гарэлкі выпіў і каўбас з'еў — гэта закрыта. Вось чаму, хто прыпадкова папаў ці па несьвядомасьці быў уцягнены ў банду афэрыстаў, цяпер выходзяць з яе, адтрасаючы пыл з ног сваіх і заклікаючы ўсіх, хто мае яшчэ хоць трохі сумленьня й годнасьці чалавека, кідаць гэтую банду. Дык цяпер мы бачым, з якіх малойчыкаў зьлеплена банда Паўлюкевіча. „Бурачок—бел.".

Занятак пастыраў.

30.XII 27 г. прыехаў у нашу вёску Зарэчча, Карэліцкай гміны, Навагрудзкага павету, наш поп па-Калядзе з сваею меркаю. Хадзіць па хатах з прыгаворкаю, кажучы: „вось гэту мерку аўса, а на верх каўбаса". А мерка яго ня менш, як 15 фунтаў. Не глядзіць поп на тое, што нашыя сяляне ня хочуць залячыць тых балячак, каторыя нанясла сусьветная вайна. Вярнуліся да дому ў 1918 годзе.

На ўсю нашую вёску, каторая мела 50 дамоў, асталася толькі 15 хат. Багацейшыя пабудаваліся, а бедныя і цяпер жывуць у лазовых хатах: зімою вада замярзае і бульба мёрзне ў хатах. Вось якое нашае жыцьцё няшчаснае, а наш айцец Ізмаіл, ня гледзячы на гэта: „апошняе кажа — дай — бо гэта ня мне, але Богу". А як хто ня дасьць, бо ведама няма чаго даць, дык запісвае ў кнігу. Дык ёсьць людзі багабаязныя — апошняе аддаюць. **А. Зарэцкі.**

Ад рэдакцыі: Спадзяёмся, што такіх людзей ужо мала.

Плады папоўска-ксяндзоўскай працы.

Неаднойчы на шпальтах беларускіх газэт былі зьмяшчаныя факты, якія ня раз паўтараюцца на нашай многапакутнай бацькаўшчыне, а іменна—розьніца паміж каталікамі-беларусамі, і беларусамі-праваслаўнымі, і ўсё дзякуючы палітыцы нашых айцоў духоўных, каторыя проста нацкоўваюць адных на другіх. На гэтым груньце стаўся цікавы інцыдэнт у вёсцы Круты-Бераг, Гарадзейскай воласьці на праваслаўны Новы Год. Бацька і матка каталікі ўзялі праваслаўных кумоў, якія па незалежным ад іх прычынам, ахрысьцілі дзіця не ў ксяндза, а ў сьвяшчэньніка. Па прыезьдзе дамоў, як даведалася матка, што дзіця яе ахрышчана ў папа, кінула на зямлю хрэст і сьвечкі, каторыя былі даны дзіцяці пры хрысьце і стала лаяцца няпрыстойнымі славамі на праваслаўную рэлігію, на кумоў і на ўсіх праваслаўных гасьцей. Адным словам зрабілася каша; кожны з гасьцей стараўся абараняць сваё, мусіць скора на падмогу гэтай дурной сварцы, пашлі-б уход бутэлькі, але на-дзіва ўсё кончылася добра,—уся гэта камэдыя скончылася толькі сваркаю.

Вось, браты-беларусы, усё гэта робіцца па нашай нясьвядомасьці і цемнаце. Каб мы меней верылі нашым тоўстапузым праведнікам, а часьцей заглядалі-б у нашу родную беларускую газэту, то тагды-б гэтай розьніцы ў нас ня было-б. **Кум.**

З Т-ва Бел. Школы.

Як яны „пазваляюць"...

(В. Клетная, Пружанскі пав.).

Клетнаўскі гурток Т-ва Бел. Шк. узяўся за працу. Мы, сябры, пачалі рабіць рэпэтыцыі і думалі ладзіць вечарыны-спэктаклі, але каб-жа не перашкоды ад мясцовай улады!—Вось нашым гуртком пададзена заява да Пружанскага Старосты аб дазвол на спэктакль. Пасьля гэтага не аднаразова пасылалі па дозвол свайго прадстаўніка, але за кожным разам староста адпраўляў да хаты без дазволу і бяз жадных матываў, а пасьля праз пэўны час адказаў, што няможна рабіць вечарыны ў школе. Тады мы выбралі дом самы большы ў нашай вёсцы і хацелі паставіць там, але таксама староста ня даў дазволу; сказаў, што не адпаведнае памешканьне для спэктакляў. Цяпер мы задумалі збудаваць „Народны Дом",—гэта будзе нам каштаваць каля 10.000 зл., як сказаў староста, а яшчэ да таго дазвол ад ваяводзства і плян каля 700 зл.

Скажыце, паважаныя грамадзяне, скуль-жа пачынаць? **Колас.**

Працы Гуртпоў Т-ва Беларускае Школы.

(В. Сялец, Ганчарскай вол., Лідзкага пав.).

18 сакавіка 1928 г. Сялецкім гуртком Т-ва Бел. Школы быў наладжаны спэктакль-вечарына, на якім было адыграна наступнае: „Пан міністар", пры вельмі добрым выкананьні роляў. У часе перарываў граў струнны аркестр. Пасьля была дэклямацыя беларускіх вершаў. Спэктакль закончыўся сьпевам беларускага гімну „Ад веку мы спалі"... Усе госьці былі вельмі задаволены спэктаклем, аб чым сьведчылі воплескі.

Шчырая падзяка ўсім удзельнікам, якіх заклікае гурток да далейшае працы.

Беларусы у Латвіі.

Беларускі народны тэатр у Рызе.

24-га сакавіка ў фабрычным раёне м. Рыгі, на так-званай Чырвонай Дзьвіне на Сымонаўскай вул. № 16 адчыніўся Беларускі Народны Тэатр.

Адчыненьне Беларускага Тэатру ў Рызе зьяўляецца новым, вельмі важным дасягненьнем беларускае нацыянальнае меншасьці ў Латвіі. Да адчыненьня свайго сталага тэатру латвійскія беларусы рыхтаваліся ўжо даўно, але толькі ў гэтым годзе здолелі паставіць гэтую справу на належны грунт.

Першая спроба заложыць сталы беларускі тэатр была зроблена ў Латвіі яшчэ ў 1921 годзе. Высілкамі гр. г. К. Езавітава і І. Дварчаніна была арганізавана вандроўная беларуская трупа, якая, пад кіраўніцтвам рэжысэра С. Заліўскага, з вялікім посьпехам паставіла шэраг беларускіх спэктакляў у Дзьвінску, Рэжыцы, Краслаўцы і Вароўцы, выклікаючы ўсюды зацікаўленьне да беларускага мастацтва і ўзбуджаючы сярод беларусаў нацыянальную сьвядомасьць. Аднак, адсутнасьць якое колечы дапамогі і вялікія выдаткі на раз'езды, якія рабіліся часта-густа коньмі на вялікую адлегласьць, спынялі працу вандроўнае трупы і змусілі абмяжавацца тэатральнаю працаю ў м. Дзьвінску.

Увесь 1922 год у Дзьвінску, пад кіраўніцтвам гр. гр. Э. Будзько і К. Езавітава ды пад рэжысурай маладога артысты Я. Камаржынскага, рэгулярна працуе новая беларуская трупа, якая ладзіць свае спэктаклі ў мястовым клюбе, у зале латгальскага клюбу „Саўле", у клюбе чыгуначнікаў і інш., ды нарэшце, адважваецца ўзнавіць спробы вандроўнае трупы і выяжджае ў Прыдруйшчыну, Ізабельшчыну і іншыя беларускія гміны Латгаліі.

З адчыненьнем з пачатку 1922 — 1923 навучальнага году ў Дзьвінску і Люцыне беларускіх гімназіяў і з разьвіцьцём беларускае школьнае працы ў Латгальскай правінцыі, беларуская тэатральная праца вельмі пашыраецца. На ўзор вандроўнае і дзьвінскае трупы, на вёсках паўстаюць гурткі аматараў, якія, пад кіраўніцтвам беларускіх вучыцялёў, робяць шматлічныя пастаноўкі ў вясковых беларускіх школах. У гэтай працы прымае ўдзел ужо значны лік выдатных беларускіх сіл і выяўляюцца новыя сілы. З працаўнікоў 1923 і 1924 гадоў асабліва трэба адзначыць, апрача ўжо ўспамінаных грамадзян, працу грамадзянкі П. Мядзёлкі, якая кіравала драматычнаю дружынаю Дзьвінскае Белар. Гімназіі, гр. С. Казякі, які кіраваў працаю драматычнае дружыны Люцынскае Белар. Гімназіі, ды вясковага настаўніка М. Талерку, які ладзіў пастаноўкі з вучнямі сваей Шнекаўскае школы ды з бальбінаўскай моладзьдзю ў Бальбінаве, Пустыні і Прыдруйшчыне.

У пачатку 1924 году сярод беларускага грамадзянства ў Латвіі пачаўся рух дзеля адчыненьня асобнага тэатральнага беларускага Т-ва, якое ўзяло-б на сябе аб'яднаньне ўсіх тэатральных пачынаньняў беларускае меншасьці і ўзялася за арганізацыю сталага беларускага тэатру, забясьпечыўшы яму належныя сродкі на працу.

На вялікі жаль, арганізацыя беларускага тэатральнага Т-ва не змагла адбыцца ў 1924 годзе, бо знамяніты Беларускі Працэс у Латвіі, які цягнуўся з сярэдзіны 1924 г., да сярэдзіны 1925 году, спыніў амаль усе праявы беларускага грамадзкага жыцьця ў Латвіі на цэлыя два гады. Аматарскія пастаноўкі, зразумела, адбываліся, але арганізацыя сталага Тэатру затармазілася на значны час.

Толькі ў 1927 годзе адчынілася, нарэшце, Беларускае Тэатральнае Т-ва ў Латвіі, якое арганізавала ў Дзьвінску і Рызе студыі і для аматараў, пад кіраўніцтвам выдатных артыстаў, а ў сакавіку 1928 года адчыніла Беларускі Народны Тэатр у Рызе ды паклала пачатак арганізацыі гэткага Народнага Тэатру і ў Дзьвінску.

* * *

У дзень адчыненьня Беларускага Народнага Тэатру ў Рызе, 24-га сакавіка, стаўлена была вядомая п'еса Янкі Купалы „Паўлінка". П'еса прайшла з добрым пасьпехам і цёпла спаткана латвійскай прэсай, якая, апрача рэцэнзіяў, зьмясьціла яшчэ і фатаграфіі артыстаў і асобныя сцэны.

Рэжысэрам Рыскага Беларускага Народнага Тэатру запрошаны выдатны артыст Латвійскага Нацыянальнага Тэатру, грам. Ян Шабэрт, які зьяўляецца вучнем вядомага расейскага артысты Станіслаўскага. Першая пастаноўка была рэалістычнай, але далей будуць роблены спробы і канструктыўныя.

З маладых артыстаў найбольш здольнымі выявілі сябе: Надзея Мікалаева (Паўлінка), Мікола Трубецкі (Пранцісь) і Парасьна Рамаюўская (Альжбэта).

Рыскі Беларускі Народны Тэатр ня думае абмяжавацца выключна працаю сярод рыскіх беларусаў, але намеціў сабе шэраг пастановак і ў правінцыі. Першыя дзьве пастаноўкі адбудуцца ў Люцынскім павеце: 16-га красавіка ў Старай Слабадзе, а 17-га красавіка ў Руждынах; тутака ўгідзе тая — „Паўлінка".

У сваёй працы Беларускі Народны Тэатр спадзяецца на падтрымоўку беларускага грамадзянства і Латвійскага Культурнага фонду, які ўжо зрабіў першае невялічкае асыгнаваньне ў ліку 600 латаў.

Кастусёнак.

Паштовая скрынка.

Адзін з выбаршчыкаў, **Каснучы і П. Мышко.** Вашы карэспандэнцыі перадалі для нашых паслоў, як матэр'ял для інтэрпэляцыяў. — **Яицы.** Ваша карэспандэнцыя не падыходзіць да друку. Вы лепш пішыце аб жыцьці сваей ваколіцы ці воласьці. — **Вязьню А. Антановічу.** Шчыра дзякуе Вам рэдакцыя за добрыя Новагодныя пажаданьні.—**Ал. Амэльяновічу і А. Недавучанаму.** Вашы вершы непадыходзяць да друку, лепш пішыце карэспандэнцыі аб цяперашнім жыцьці. — **Падпішчыку № 3560.** Карэспандэнцыі Вашай ня можам зьмясьціць, бо адыйшоў той час выбарчы, пішыце з цяперашняга жыцьця. — **Студзёнскаму.** Ваша карэспандэнцыя не падыходзіць да друку ў нашай газэце, бо мы наагул унікаем ад розных асабістых непаразуменьняў і лаянак. — **Чужому.** Вашы карэспандэнцыі па-магчымасьці будзем зьмяшчаць. Вы лепш пішыце з жыцьця агульнага і ніколі не чапайце асабістага і заўсёды пішыце на аднэй старонцы паперы. — **Зацікаўленаму.** Вы лепш самі пастарайцеся зрабіць уплыў на сваіх суседзяў, каб яны ішлі па правідловай дарозе. Пішыце заўсёды чарнілам і на аднэй старонцы, па магчымасьці будзем зьмяшчаць. — **Э. Капачу.** Ваша карэспандэнцыя не магла быць зьмешчана, пэўна Вам з ведамых прычынак. Запрашаем Вас быць сталым нашым карэспандэнтам. — **Недалёкаму.** Вам тое самае, што і сябру № 2453. Пішэце аб цяперашнім жыцьці. — **Шчупаку.** Ваша карэспандэнцыя з папраўкай будзе зьмешчаны ў наступным нумары. — **„Псэўдоніму".** Карэспандэнцыя Ваша з папраўкай будзе зьмешчана. — **„Выбаршчыку".** Вам тое самае, што і „Псэўдоніму". — **Дзядзьку Пяруну.** Вы лепш пастарайцеся самі-ж з сваімі калегамі зрабіць уплыў на свайго солтыса, а ня лаяцца праз прэсу і наша газэта наагул унікае ад асабістых непаразуменьняў. — **Махнібраму.** Ваша карэспандэнцыя ня можа быць зьмешчана, бо гэтак неведама, ці запраўды зьяўляецца „шпіцлем" Пётра Марцішонок ці можа ў Вас свае асабістыя непаразуменьні. — **Селяніну вёскі Лані і Аднасяльчаніну.** Вашы карэспандэнцыі не маглі зьмясьціць, пэўна Вам ведама па якіх прычынах. Пішэце. Будзьце сталым нашым карэспандэнтам. — **Ачавідцу.** Вам тое самае, што і Аднасяльчаніну. — **Дванаццатаму Я.** Вашы вершы патрабуюць шмат апрацоўкі. Пішэце, як найбольш, можа з часам будзеце паэтам, бо ў Вас ёсьць прыродная жылка да гэтага.

Рэдактар-Выдавец: А. Лагода.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.